


# «КАДРЫ ВЫРАШАЮЦЬ УСЁ!»

Гэта папулярны і досыць жывучы лозунг. Ва ўсіх рэспубліках былога Савецкага Саюза ім пачалі кіравацца яшчэ з даваенных часоў і, як выглядае, не кідаюць па сёння. Ва ўсякім разе, куды ні ткніся, паўсюль аб'явы кшталту: «Фірме патрабуецца галоўны бухгалтар...», прадпрыемству — эканаміст, краме — прадаўцы. І тут жа, побач усе патрабаванні да «кандыдатаў»: каб была адпаведная адукацыя, каб стаж работы не меней за тры гады, каб нават узрост...

Наймальнікаў, працадаўцаў зразумець няцяжка: сёння яны могуць выбіраць, прычым самых дасведчаных. Але ж «кандыдатам», каб гэткімі стаць, трэба недзе паспрабаваць, павучыцца, магчыма, нават нарабіць памылак. А дзе? Ды, вядома ж, у нейкіх іншых арганізацыях. Дык нехай яны, маўляў, і рыхтуюць спецыялістаў, а мы пераманім гатовых...

У сувязі з гэтым хачу расказаць, як гадаваў сабе кадры старшыня калгаса з майго дзяцінства.

...Даўно гэта было. Ужо і не верыцца, што ў вёсках тады (у сярэдзіне мінулага стагоддзя) віравала жыццё, што яны былі вялікія і шматлюдныя, што ў сем'ях нараджалася па трое-чацвёра малых...

Адпаведна шмат было і пачатковых школ.

Потым, пасля іх заканчэння, дзеці хадзілі ўжо ў сярэднія школы, якія, як правіла, знаходзіліся на цэнтральных сядзібах калгасаў.

Дык вось. Нас — і малых, і трохі большых, з розных навакольных вёсак і вёсачак — грамада набіралася будзь здароў: ідзём са школы — уся вуліца ўшыркі занятая (машыны ж тады не гойсалі).

Але, здаралася, адна даганяла: старшыня, на службовым «козліку». Пад'едзе і амаль заўсёды спыніцца. Адчыніць дзверцу і пытае ў нас:

— Ну, хваліцеся, хто што атрымаў?

— Я — пяцёрку!

— Я — дзве!

— Я — чатыры і пяць, — наперабой выхваляюцца выдатнікі.

— А вы чаго заціхлі? — пытае тады старшыня ў хлопцаў, якім хваліцца няма чым.

За іх адказвалі «сябры»:

— А ў Петрыка двойка па літаратуры...

— А Грышка па матэматыцы задачу не рашыў...

— Праўда? — удакладняў кіраўнік гаспадаркі.

Тыя ўбок адводзілі вочы і яшчэ ніжэй апускалі галовы.

— Ну тады... сядайце ў машыну, — загадваў ім старшыня. — Падвязу вас дадому.

Тыя не маглі спярша скрануцца з месца, не верылі сваім вушам...

— Смялей! — камандаваў ім старшыня і сапраўды падвозіў. Сам! На «козліку»! На высокай хуткасці... Са свістам, можна сказаць. І да самых весніц!

Калі б такое здарылася толькі аднойчы, і дзеці, і дарослыя тры дні пагаварылі б, а на чацвёрты забыліся. Але ж не: цягам навучальнага года гэта паўтаралася не раз.

Урэшце выдатнікі ды іх бацькі сталі крыўдаваць, высвятляць прычыну: маўляў, чаму гэта старшыня падвозіць троечнікаў, двоечнікаў, а то і «калышнікаў» (лепшых, трэба сказаць, ён таксама падвозіў, але радзей)?

І той, «заціснуты ў кут», патлумачыў, што выдатнікі пасля школы хутчэй за ўсё паступяць недзе вучыцца, атрымаюць дыпломы і застануцца ў гарадах. Іншая рэч — тыя ж троечнікі. Ім можна даць накіраванне ў прафтэхвучылішчы. Яны пасля вучобы вернуцца на працу ў калгас.

— Гэта будуць МАЕ кадры, — казаў старшыня. — Мне з імі жыць і працаваць.

Так урэшце яно і адбывалася. У гаспадарцы некалькі дзесяцігоддзяў не было праблем з тымі ж даяркамі, трактарыстамі, аграномамі... Яны асядалі на сваёй жа, роднай зямлі, хто здалёк, хто зблізку прывозілі сабе сужэнцаў, стваралі сем'і. Іх дзеці да тых самых настаўнікаў хадзілі ў пачатковыя школы, потым у сярэднія, вёскі жылі...

Вось такая была кадравая палітыка ў нашага старшыні калгаса: мудрая, перспектыўная, выніковая. І шкада, што пра гэты досвед не пісалі тады ва ўсіх газетах, не распаўсюджвалі па іншых гаспадарках. Глядзіш, зусім па-іншаму выглядалі б вёскі: не было б сярод іх так званых выміраючых.

**Валерый Гаўрыш,**
*г. Чавусы.*

# ЭХ, КАБ НЕ ДРАБІНЫ...

Каханне было маладым і вельмі гарачым. Прычым настолькі, што прыйшлося ствараць сям'ю. Мужу на той час ледзь стукнула васямнаццаць, жонцы — усяго шаснаццаць. Але ж зажылі: з часам нарадзілі дзяцей, пагадавалі іх і нават не развяліся, хоць збіраліся разоў сто, а можа, і больш!

Рэч у тым, што ўсе гадочкі Мар'я люта, можна сказаць, раўнавала свайго Івана. Прычым не без падстаў, бо імпэт гэтага вясковага лавеласа стаў крыху спадаць хіба што пад старасць, а так... Чаго толькі не было!

Іванавы ўспаміны, як выглядае, у большасці прыемныя, Мар'іны — што той чэмер...

— Бабнік ён яшчэ той! З маладосці ніводнай спадніцы не прапускаў! — прызналася неяк яна ўжо дарослым сямейнікам.

— Ды кінь ты, — паспрабаваў перапыніць Мар'ю муж.

— А чаму гэта? Я што — можа, няпраўду кажу? — гнула сваё жонка. — І сам ты вочы разуй: у вёсцы ж палова дзяцей на цябе падобныя!

— Ну бабы... Вам абы языкамі мянціць, — бурчэў стары. — Нясеш тут розную лухту.

— То, можа, няпраўда, што ты з Нінкай-блудніцай...

— Не, няпраўда.

— І з Любкай, скажаш, няпраўда?

— Не...

— А з Гэлькай? З Гэлькай ты таксама на вышкі не лазіў? — гарачылася жонка. — Дзеткі, ці паверыце: у яе, у гэтай прастадайкі, вяселле ў хаце было — дачку аддавала... Захацела як быццам каўбасы на сталы падрэзаць. Спадніцай крутнула, кош у рукі ўзяла — і па драбінах на гарышча... Толькі лыткі яе схаваліся, гэты распуснік, бачу, следам палез... Ага, памагчы!.. Пагляджу ж, я думаю, як ён памагае. Хвілін колькі счакала і таксама на вышкі. Вочы б не бачылі такога паскудства! Раздзеў ён Гэльку, абвіўся, як вуж... Што — скажаш, зноў няпраўда?!

— Ды не... Зараз не скажу. Вось гэта ўжо было, — не стаў адпірацца Іван. — А ўсё чаму? Дурны быў, гарачы...

— Няўжо дайшло?! — не паверыла вушам жонка. — Няўжо зразумеў і цяпер шкадуеш?

— Ды яшчэ як!.. Дарваўся ж, не раўнуючы, як дурань да мыла: не сцяміў, што *ўслед за сабой трэба было драбіны ўсцягнуць...*

Поп сваё, карацей, а чорт — сваё.

**Фаіна Касаткіна,**
*г. Паставы.*

# ПРАГА ДА МУЗЫКІ

Усё далей і далей адыходзяць падзеі майго маленства, але памяць надзейна трымае іх, і ўсплываюць яны так ясна...

Дзякаваць Богу, нам з мамай не давялося жыць пад немцамі, зносіць іх здзекі. Праўда, што такое бомбы, я помню, і што такое станцыі, біткам забітыя людзьмі — таксама. Нялёгкай была наша дарога на ўсход, у эвакуацыю, нялёгкім было і жыццё. Але ж цяпер не пра гэта, цяпер пра тое, што людзі заўжды заставаліся людзьмі.

...Нас, эвакуяваных, прынялі ў адным з калгасаў Саратаўскай вобласці. Мне тады ішоў адзінаццаты год:ростам — кату па пяту, як той казаў, сілы — як у вераб'я, а вось спрыту... З-пад зямлі вырастала... Там, дзе трэба і не трэба.

Больш за ўсё мяне вабіў Валодзя, наш вясковы музы́ка. І не столькі сам, колькі яго гармонік, яго балалайка. Слухаць магла дзень і ноч. А ўжо калі Валодзя дазваляў мне дакрануцца да кнопачак ці правесці пальцамі па струнах, шчасце не мела межаў!

Помню, дачакаўшыся вясны, вясковая моладзь (а мы ж за ёю) пайшла на луг. Там было вельмі прыгожа і раздольна, там было весела і нават... сытна, бо мы збіралі розную траву і набівалі ёй свае галодныя жываты.

Але ж для таго, каб апынуцца на лузе, трэба было перайсці рэчку. Для гэтага ў адным месцы ляжала кладка — вузкая, слізкая, так што не кожнаму ўдавалася прайсці па ёй. Хто-ніхто падаў у ваду, падымаючы фантаны пырскаў і рогату.

Дык вось, неяк наш Валодзя (а ён заўсёды ішоў наперадзе) пабаяўся ісці па кладцы з гармонікам. А таму, здымаючы яго з пляча, спытаў:

— Э-э, хто перанясе?

— Я! — тут жа крыкнула я, молячы вачыма: «Дай!.. Перанясу!»

Чаму Валодзя згадзіўся, не разумею дагэтуль. Бачыў жа, якая кладка, якая я, ведаў, колькі важыць гармонік.

Але ж ён адумацца, мусіць, не паспеў, як інструмент (ура!) апынуўся ў мяне ў руках. Як я, ад шчасця не адчуваючы цяжару, прабегла палову «шляху». А далей...

Як і трэба было чакаць — зляцела з кладкі... Разам з гармонікам.

Усе на нейкі міг аслупянелі, а потым над ракой пачуўся гэткі рогат, што ўзняліся вароны...

Не смяяўся толькі Валодзя: ён скочыў у неглыбокую ваду і, агрэўшы далонню па патыліцы, выцягнуў з рэчкі спачатку мяне, а потым гармонік...

Гулянка была не гулянка: мне было холадна, сорамна, крыўдна, я баялася падысці да музы́кі: ён жа трохі вучыў мяне іграць — праўда, на балалайцы...

Я, дарэчы, потым сама зрабіла яе: да дошчачкі прымацавала струны з пераплеценага конскага воласу. І Валодзя не пасмяяўся: ён сказаў, што нейкія меладычныя гукі мой «інструмент» выдае!

А галоўнае, што аднойчы тую маю «балалайку» ўбачылі салдаты з суседняга вайсковага аэрадрома. І потым у падарунак мне прынеслі... сапраўдную домбру!

Усе яе звалі «гарбузом», але гэта не перашкаджала мне іграць — адводзіць душу.

...І сёння, праз доўгія-доўгія гады я схіляю галаву перад тымі салдатамі. Чужая ж была дзяўчынка, а бач — зразумелі прагу да музыкі. І, як маглі, падтрымалі.

**Раіса Васільева,**
*г. Гомель.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Традыцыі

# ПУСЦІЦЕ ДЗЯЦЕЙ У ХРАМ

**Гэта ўжо за правіла: летнікі ў дзіцячым садку-яслях №6 пачынаюцца з экскурсіі ў храм. Благаславенне на іх ад настаяцеля айца Грыгорыя атрымала дырэктар гісторыка-краязнаўчага музея Раіса Горбач. Яна і паведаміла, што экскурсіі праводзяць з 2007 года, а з 2010-га пачала дзейнічаць цэлая праграма супрацоўніцтва музея з царквой.**

— Хрыстос уваскрос! — так павітала экскурсаводка выхаванцаў дзіцячага садка «Алеся».

— Сапраўды ўваскрос! — адказваюць дзеці.

І Раіса Іванаўна тлумачыць, што так вітаюцца праваслаўныя цэлых 40 дзён — ад Вялікадня да Узнясення.

Потым яна вучыла дзяцей правільна хрысціцца: «На лоб, каб асвяціць нашы думкі; на жывот, каб асвяціць жыццё; на правае і левае плячо, каб асвяціць нашы ручкі на добрыя справы».

Дзеці са шчырай непасрэднасцю паўтаралі рухі.

На тэрыторыі святыні Раіса Іванаўна, улічваючы ўзрост экскурсантаў, каротка расказала, што кожны храм мае сваю назву (наш — у гонар іконы Божай Маці «Дзяржаўная»), сваю архітэктуру. Дзеці даведаліся, як сябе паводзіць у царкве, як правільна прыкласціся да іконы на прастоле, паставіць свечку аб здароўі родных і за супакой душы памерлых, дзе праходзіць споведзь.

Пачулі малыя і аб некаторых абразах: у прыватнасці, аб іконе «Сямістрэльная» перад якой моляцца за змякчэнне сэрцаў сваіх крыўдзіцеляў і ўласнага сэрца — каб Бог дапамог дараваць свае крыўды; аб іконе «Усіх тужлівых Радасць», перад якой людзі просяць Божай дапамогі ў складаны час і перад якой трэба вучыцца быць удзячным — не забываць дзякаваць Богу за дапамогу, славіць Яго імя.

Напрыканцы экскурсіі Раіса Іванаўна завяла дзяцей у таямнічы пакой, дзе адбываецца хрышчэнне, паказала купель, у святую ваду якой тройчы (у імя Айца і Сына і Святога Духа) бацюшка акунае маленькіх падчас хрышчэння.

...Якая карысць ад такіх экскурсій? Адказ на гэта пытанне мне падказала дзіцячая ці-



каўнасць і шчырасць, «Пусціце дзяцей прыходзіць да Мяне і не перашкаджайце ім, бо такіх ёсць Царства Божае. Праўду кажу вам: хто не прыме Царства Божага, як дзіця, той не ўвойдзе ў яго. І, абняўшы іх, усклаў рукі на іх і благаславіў іх» (Евангелле ад Лукі, 10, 14-16).

**Валянціна БОБРЫК.**

■